# З ГІСТОРЫІ ВЫКАРЫСТАННЯ ЛЕКАВЫХ РАСЛІН НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

**Рамэйка Т. І.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Навуковы кіраўнік – *Сняжыцкая А. С.*

На працягу многіх стагоддзяў людзі звярталіся да народнай медыцыны.

Народная медыцына – гэта дзіўны дар, які існуе ў прыродзе для лячэння нашага арганізма. На жаль, мы не заўсёды гатовы карыстацца гэтым дарам. Гаючыя ўласцівасці народнай медыцыны, якімі ў першую чаргу валодаюць лекавыя расліны, сапраўды невычэрпныя. Як метад лячэння, народная медыцына актыўна выкарыстоўваецца на сённяшні дзень. Лічыцца, што няма ніводнай расліны, якая б не аказвала якога-небудзь уздзеяння на арганізм чалавека.

Яшчэ Гіпакрат, які жыў у IV–V стагоддзях да Н. Х, павучаў урачоў “не забывать о разведывании средств у народа, потому что между ними могут найтись и такие, которые скажутся полезными для лечения болезней” [1].

Што датычыцца непасрэдна народнай медыцыны беларусаў, то яна з’яўляецца той часткай традыцыйнай культуры нашага народа, якая прадстаўляе сабой сінтэз вераванняў, рэлігійных практык, багатых ведаў аб спосабах падтрымання здароўя з дапамогай лекавых раслін і абрадаў.

Аналіз літаратурных крыніц, а таксама прыватныя гутаркі студэнтаў-медыкаў (членаў гісторыка-этнаграфічнага клуба “Спадчына”) са старэйшымі жыхарамі свайго рэгіёна сведчаць аб тым, што пачатковымі медыцынскімі ведамі валодала большасць насельніцтва Беларусі. У кожнай сям’і дакладна ведалі правілы збору лекавых раслін, і якая частка гэтай расліны (кара, сцябло, кветка, лісце, пупышкі, сок) выкарыстоўвалася ў народных рэцэптах.

Традыцыйна збіралі зёлкі на Купалле. Лічылася, што травы, сабраныя на гэта свята, надзяляліся звышнатуральнай сілай і валодалі надзвычайнымі лекавымі ўласцівасцямі. Жыхарка в. Патапавічы, Іванаўскага р-на Кузьмінчук Я. А., 1942 г. н., успамінае: “Раніцой, як спадзе раса, на Яна дзяўчаты і жанкі спяшаліся ў лес, на луг, у поле за травамі. Набіралі столькі, як падняць. А назаўтра ішлі да цэрквы, каб асвяціць. Потым іх сушылі, а захоўвалі паблізу абразоў. А потым да наступнага Яна лячылі імі хвір” (*запісала Кузьмінчук А.*).

Часта збор лекавых траў суправаджаўся пэўнымі малітвамі. А некаторыя жанчыны проста сваімі словамі прасілі: “Дапамажы мне…”, “Няхай дапаможа ад хваробы…”, “Нахай пазбавіць ад болю”. А калі завараную траву давалі хвораму, то чыталі такую замову: “Божая Маці па полі хадзіла, траўкі збірала і (імя хворага)… помашчы давала” (*Івацэвіцкі р-н, в. Корачын, ад Гваздзёвай Я.Ф.,1939 г.н., запісала Гваздзёва К.*).

Практычна ў кожнай сям’і ўмелі лячыць захворванні страўніка, прастуду, боль галавы, боль суставаў і інш. Пазбавіцца ад немачы дапамагаў



Репозиторий ГрГМУ

рамонак лекавы, зверабой, крапіва, крываўнік, бяссмертнік, чабор, часнык, цыбуля, палын, трыпутнік і інш.

Усе лекавыя расліны заслугоўваюць увагі, але адна з вышэй пералічаных, як ні адна іншая, паказвае сувязь са святам Купалля (Яна, Івана Купала) – найстаражытнейшага язычніцкага свята ў гонар сонца і росквіту зямлі. Яно звязана з часам летняга сонцастаяння, калі прыродныя сілы набываюць найбольшую моц. З цягам распаўсюджання хрысціянства гэтыя даўнія абрады былі прымеркаваны да дня нараджэння Іаана Хрысціцеля.

Назва гэтай расліны здаецца вельмі грозная – зверабой. У некаторых раёнах яе называюць прыгожа і з таямнічым адценнем – святаяннік. Безумоўна, зверабой не забівае звяроў, але па-сапраўднаму згубна ўздзейнічае на шкодныя аганізмы. Напэўна таму, што зацвітае на свята Яна, калі Купальская ноч з'яўляецца часам цудаў. Яшчэ зёлку называюць святаянскае зелле (Бераставіцкі р-н), дзюравец (Віцебшчына і Магілёўшчына), бо на пялёстках кветак і лісточках можна ўбачыць шмат дробных дзірачак. Гэтая травяністая расліна з жоўтымі кветкамі і плямістым лісцем нарыхтоўваецца ў час цвіцення. Святаяннік прыгадваецца шмат у якіх старадаўніх лячэбніках і траўніках. “Як без мукі нельга спячы хлеб, так без святаянніку нельга лячыць многія хваробы людзей і жывёл”, – сцвярджалі лекары мінулага. Ён славіўся як лекавая расліна ад “дзевяноста дзевяці хваробаў”. І сапраўды, святаяннік ужываецца ў розных галінах медыцыны. Яго завараюць і п'юць пры страўнікава-кішэчных захворваннях, хваробах печані, крыві, скуры [2].

На жаль, у рамках дадзенага артыкула немагчыма апісаць усе гаючыя асаблівасці большасці лекавых раслін, якімі карысталіся і карыстаюцца беларусы і сёння, але бясспрэчна адно – народныя метады лячэння – аснова сучасных медыцынскіх дасягненняў.

Народныя метады лячэння – вынік працяглых назіранняў і перадача вопыту з пакалення ў пакаленне. Гэта каштоўная спадчына, якая адлюстроўвае здольнасць чалавека адапціравацца да навакольнага асяроддзя і ўзаема-дзейнічаць з ім.

Літаратура:

1. Лён – исцеляющий и омолаживающий. – URL: https://www.booksite.ru/fulltext/iscel/1.htm (дата обращения: 17.11.2025).

2. У краіне чароўных зёлак. – URL: http://bialorushajnowka.pl/images/PROJEKT_PRZYRODNICZA_SKARBNICA/Konspekty/5W-krainie-magicznych-ziol/BY_-_w_krainie_magicznych_ziol.pdf (дата звароту: 26.09.2025).

3. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў [Іван Якаўлевіч Лепешаў] – URL: https://pda.coollib.in/b/302861-ivan-yakawlevich-lepeshaw-etyimalagichnyi-slownik-frazealagizmaw/read (дата звароту: 10.09.2025).

Рэпазіторый ГрГМУ